РАШЭННЕ
калегіі галоўнага ўпраўлення
ідэалагічнай работы, культуры і
па справах моладзі Брэсцкага
аблвыканкама
21 лютага 2018 г. № 3

г. Брэст

Аб выніках абласнога тура
XXVI рэспубліканскага агляду-конкурсу
«Бібліятэка - асяродак нацыянальнай
культуры»

З мэтай узмацнення ролі публічных бібліятэк у фарміраванні нацыянальнай свядомасці насельніцтва, распаўсюджвання ідэі беларускасці, прапаганды нацыянальнай спадчыны, гісторыі, літаратуры, мовы, народнай культуры, падтрымкі і развіцця чытання Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь штогод праводзіць рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».

У абласным туры XXVI рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» прынялі ўдзел 7 бібліятэк вобласці: Баранавіцкая ЦРБ імя Я. Чачота ДУК «Баранавіцкая РЦБС», Здзітаўская СБ ДУК «Бярозаўская РБС», Дамашыцкая СБ ДУК «Пінская РЦБС», Драгічынская РДБ ДУК «Драгічынская РЦБС», ДУК «ЦБС г. Баранавічы», Пінская ЦГБ ДУК «Пінская ГЦБС», Маларыцкая ЦРБ ДУК «Маларыцкая РЦБС». Матэрыялы, прадстаўленыя ў абласны аргкамітэт, уключалі: рашэнні і выпіскі з пратаколаў пасяджэнняў гарадскіх і раённых аргкамітэтаў па падвядзенні вынікаў конкурсу, аналітычныя даведкі аб рабоце бібліятэк за апошнія тры гады, шэраг змястоўных дадаткаў у выглядзе інфармацыйна-бібліяграфічных і аналітычных матэрыялаў, метадычных распрацовак, сцэнарных матэрыялаў, рэкламнай прадукцыі, фотаальбомаў, ксеракопій публікацый у мясцовым друку, электронных прэзентацый, відэаролікаў і г.д.

Разглядзеўшы конкурсныя матэрыялы і заслухаўшы інфармацыю намесніка дырэктара па бібліятэчнай рабоце УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага» Стрыжэвіч А.Я., калегія галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі ВЫРАШЫЛА:

1. Прызнаць пераможцамі абласнога тура XXVI рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры»:

***У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу»:***

- **Маларыцкую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Маларыцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»** (дырэктар Кузьміцкая Наталля Аляксееўна) — І месца сярод гарадскіх бібліятэк; *за плённую пошукавую і даследчую працу па вывучэнні і*

*захаванні культурнай спадчыны Маларыцкага раёна, сістэматызацыю назапашанага этнаграфічнага матэрыялу, а таксама яго папулярызацыю сярод шырокага кола насельніцтва; стварэнне электроннага рэсурсу «Фальклорна-этнаграфічная энцыклапедыя Маларытчыны» і яго прасоўванне ў віртуальнае асяроддзе для азнаямлення ўсіх зацікаўленых.*

*У намінацыі «**За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы**»:*

- **Пінскую цэнтральную гарадскую бібліятэку ДУК «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»** (дырэктар Лагодзіч Дзіна Анатольеўна) — I месца сярод гарадскіх бібліятэк; *за крэатыўны і творчы падыход да арганізацыі бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання маладых карыстальнікаў з прымяненнем сучасных методык і тэхналогій праз арганізацыю інфармацыйна-культурнага цэнтра «Максімум»;*

- **Баранавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Чачота ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»** (дырэктар Лайша Таццяна Міхайлаўна) — I месца сярод бібліятэк, абслугоўваючых сельскае насельніцтва; *за распрацоўку і ўкараненне ў практыку работы бібліятэк інавацыйных формаў і метадаў работы з выкарыстаннем камунікатыўных тэхналогій у мэтах папулярызацыі кнігі і чытання, а таксама фарміравання ў соцыуме пазітыўнага іміджу бібліятэкі.*

*У намінацыі «**За падтрымку і развіццё чытання**»:*

- **Драгічынскую раённую дзіцячую бібліятэку ДУК «Драгічынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»** (нам. дырэктара па рабоце з дзецьмі Хведарэц Антаніна Канстанцінаўна) — I месца сярод гарадскіх бібліятэк; *за садзейнічанне фарміраванню і пашырэнню чытацкага кругагляду, інтарэсаў і захапленняў юных грамадзян, а таксама развіццё іх творчых магчымасцей і арганізацыю вольнага часу праз далучэнне да ўдзелу ў летніх чытаннях;*

- **Здзітаўскую сельскую бібліятэку ДУК «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма»** (бібліятэкар Юрковіч Таццяна Мікалаеўна) — I месца сярод сельскіх бібліятэк; *за сістэмную і мэтанакіраваную работу па далучэнні да чытання розных слаёў сельскага насельніцтва, захаванні і развіцці традыцый сямейнага чытання шляхам арганізацыі змястоўных масавых мерапрыемстваў, выставачнай дзейнасці, рэалізацыі культурна-асветніцкіх праектаў і акцый.*

*У намінацыі «**За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем**»:*

- ДУК **«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы»** (дырэктар Рудкоўская Таццяна Аляксандраўна) — I месца сярод гарадскіх бібліятэк; *за высокі ўзровень інфармацыйна-бібліяграфічнай і культурна-асветніцкай дзейнасці, накіраванай на далучэнне маладога пакалення да*

*гістарычнай спадчыны сваёй краіны, а таксама за папулярызацыю здабыткаў нацыянальнага кнігадрукавання і кніжнай культуры.*

2. Адзначыць Лістамі падзякі:

- **Дамашыцкую сельскую бібліятэку ДУК «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»** (бібліятэкар І катэгорыі Селюжыцкая Сафія Іванаўна) — *за шматгадовую і плённую працу па прыцягненні да чытання дзяцей і падлеткаў пасродкам актыўнай культурна-асветніцкай дзейнасці; выхаванне ў маладога пакалення пачуццяў патрыятызму і гонару за сваю Радзіму праз папулярызацыю лепшых узораў нацыянальнай і сусветнай літаратуры.*

3. Прадставіць для ўдзелу ў XXVI рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры»:

- Маларыцкую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Маларыцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»,
- Пінскую цэнтральную гарадскую бібліятэку ДУК «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»,
- Баранавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Чачота ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»,
- Драгічынскую раённую дзіцячую бібліятэку ДУК «Драгічынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»,
- Здзітаўскую сельскую бібліятэку ДУК «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма»,
- ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы».

4. Кантроль за выкананнем рашэння ўскласці на намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама - начальніка ўпраўлення культуры Панасюка С.Б. і намесніка дырэктара УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага» Стрыжэвіч А.Я.

Старшыня калегіі,
начальнік галоўнага ўпраўлення
ідэалагічнай работы, культуры
і па справах моладзі
Брэсцкага аблвыканкама Т.М.Гагакава

39. Панасюк 21 08 50
Стрижевич 43 45 25